Верамееў С. Ф.

# Антон Неманцэвіч
## Святар і пакутнік



# Антон Неманцэвіч



Верамееў С. Ф.

# АНТОН НЕМАНЦЭВІЧ

## СВЯТАР І ПАКУТНІК

Мінск
«Альфа-кніга»
2023

УДК 271.4(476)(092)+929 Неманцэвіч
ББК 86.37(4Беи)
В31

**Рэцэнзенты:**

доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы» Э. С. *Ярмусік*;

кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі і сацыяльных навук УА «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт» А. М. *Цымбал*

**Верамееў, С. Ф.**
В31 Антон Неманцэвіч. Святар і пакутнік / С. Ф. Верамееў. — Мінск : Альфа-кніга, 2023. — 50 с.
ISBN 978-985-7272-93-8.

Антон Неманцэвіч (1893–1943) — значная постаць у гісторыі Беларускай грэка-каталіцкай царквы XX ст. Святар, потым Апостальскі экзарх, багаслоў, педагог, публіцыст і выдавец, ён прымаў актыўны ўдзел у адраджэнні ўніяцкіх парафій на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. У дадзенай працы зробленая спроба абагульніць вядомую інфармацыю пра айца Антона Неманцэвіча, прадстаўленую ў навуковых публікацыях і ўспамінах сучаснікаў, і, тым самым стварыць больш сістэматызаваны варыянт яго біяграфіі, даступны для азнаямлення ўсім жадаючым.

Кніга адрасавана прафесійным даследчыкам у галіне гісторыі хрысціянства, выкладчыкам навучальных установаў, студэнтам, а таксама ўсім, хто цікавіцца гісторыяй канфесій у Беларусі.

**УДК 271.4(476)(092)+929 Неманцэвіч**
**ББК 86.37(4Беи)**

**ISBN 978-985-7272-93-8**

© Верамееў С. Ф., 2023
© Афармленне. ТАА «Альфа-кніга», 2023

# Уводзіны

У сучаснай Беларусі жывуць прадстаўнікі 25 афіцыйна зарэгістраваных канфесій, сярод якіх ёсць і грэка-каталікі[1]. Гісторыя грэка-каталіцкай (ці ўніяцкай) царквы з'яўляецца неад'емнай часткай агульнай гісторыі нашай краіны, якую трэба вывучаць і ведаць для больш поўнага і ўсебаковага разумення як мінулага, так і рэлігійнай сітуацыі ў рэспубліцы ў цяперашні час. Асаблівую актуальнасць даследаванні ў гэтым накірунку атрымалі ў сувязі с Годам гістарычнай памяці, які быў аб'яўлены ў Беларусі ў 2022 г. Навуковы інтарэс выклікаюць персаналіі грэка-каталіцкіх царкоўных дзеячоў. Да іх ліку адносіцца і Антон Неманцэвіч.

Антон Неманцэвіч (1893–1943) з'яўляецца адной з самых значных і цікавых постацей у гісторыі Беларускай грэка-каталіцкай царквы XX ст. Святар, потым Апостальскі экзарх, багаслоў, педагог, публіцыст і выдавец, ён прымаў актыўны ўдзел у адраджэнні ўніяцкіх парафій на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст., быў перакананы

[1] Па стану на 1 студзеня 2023 г. на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь афіцыйна зарэгістравана 16 грэка-каталіцкіх рэлігійных абшчын. Для параўнання: праваслаўных — 1733, рыма-каталіцкіх — 500. Гл.: https://www.belarus21.by/Articles/kolichestvo-religioznyh-obshhin-v-respublike-belarus-na-1-yanvarya-2019-g.

ў неабходнасці еднасці хрысціянаў і прысвяціў гэтай справе ўсё сваё жыццё. Яго жыццёвы шлях сведчыць аб вернасці хрысціянскім ідэалам і асабістай мужнасці, ўяўляе прыклад самаахвярнага служэння Богу і царкве ў складаных гістарычных умовах. Ён усведамляў сябе беларусам і імкнуўся працаваць дзеля развіцця самасвядомасці і культуры беларускага народа, укараняць беларускую мову ў царкоўнае жыццё.

Асоба Антона Неманцэвіча і яго дзейнасць застаюцца малавядомымі сярод нашых сучаснікаў. Савецкая атэістычная гістарыяграфія фактычна ігнаравала яго постаць, а ў нешматлікіх артыкулах, якія з'явіліся па-за межамі Беларусі ў другой палове XX ст., і таксама ў адзінкавых публікацыях сучасных беларускіх даследчыкаў, як правіла, паўтараюцца адныя і тыя ж звесткі аб ім. У дадзенай працы мы зрабілі спробу абагульніць усе вядомую інфармацыю пра айца Антона Неманцэвіча, прадстаўленую ў навуковых публікацыях і ўспамінах сучаснікаў, і, тым самым стварыць больш сістэматызаваны варыянт яго біяграфіі, даступны для азнаямлення ўсім жадаючым.

На 2023 г. прыпадаюць адразу дзве даты, звязаныя з Антонам Неманцэвічам: 130 год з дня яго нараджэння і 80 год з яго смерці ў нацысцкай турме. У 2023 г. адбывалася таксама вельмі важная і істотная падзея ў царкоўным жыцці беларускіх грэка-каталікоў: Папа Рымскі Францыск заснаваў Апостальскую адміністратуру для вернікаў візантыйскага абраду ў Беларусі. Гэтая царкоўная структура з'яўляецца спадкаемцай экзархату, які некалі ўзначальваў айцец Антон Неманцэвіч. Усё вышэйназванае надае разгляду жыццёвага шляху гэтага грэка-каталіцкага царкоўнага дзеяча дадатковую актуальнасць.

# Дзяцінства. Маладыя гады

Антон Неманцэвіч нарадзіўся 8 лютага (28 студзеня па юліянскаму календару) 1893 г. у Санкт-Пецярбургу. Яго бацькі Ян і Вікторыя (з дому Рудзевых) былі пабожнымі рыма-католікамі, якія перасяліліся ў сталіцу Расійскай імперыі з вёскі Парчэўка Сакольскага павета Гродзенскай губерніі[2]. Даследчыкі звяртаюць увагу на тое, што бацькі Неманцэвіча паходзілі з мясцовасці, дзе некалі жылі ўніяты, якія потым, падчас ліквідацыі структур уніяцкай царквы перайшлі ў лацінскі абрад[3]. Магчыма, у сям'і захоўваліся нейкія ўспаміны аб уніі, прадметы ці звычаі, звязаныя з ёй, што ў будучым таксама магло аказаць уплыў на канфесійны выбар Антонія, але гэта толькі здагадкі.

Малады чалавек скончыў прыватную гімназію пры рыма-каталіцкім храме святой Кацярыны ў Санкт-Пецярбургу[4] (па іншых дадзеных — аптэкарскую школу[5]), пасля чаго ў 1910 г. паступіў у Магілёўскую рыма-каталіцкую

2 *Маракоў Л. У.* Рэпрэсаваныя каталіцкія духоўныя, кансэкраваныя і свецкія асобы Беларусі (1917–1964). Мінск, 2009. С. 307.

3 *Usoszyn J.* Życie i działalność o. Antoniego Niemancewicza (1893–1943): praca magistersca. Warszawa, 2005. С. 7.

4 Там жа.

5 *Гарбінскі Ю.* Беларускія рэлігійныя дзеячы ХХ стагоддзя. Жыццяпісы, мартыролагі, успаміны. Мінск-Мюнхен, 1999. С. 132.

духоўную семінарыю ў расійскай сталіцы. Нам невядомы прычыны і абставіны, якія садзейнічалі ўсведамленню ім свайго паклікання да святарства. Магчыма, ён адчуваў гэта пакліканне з маленства, а магчыма, пэўныя падзеі паўплывалі на яго жыццёвы выбар. Гэты аспект пакрыты заслонай невядомасці.

Антон Неманцэвіч паспяхова скончыў семінарыю і ў 1918 г. працягнуў вучобу ў Імператарскай Мітрапалітальнай рыма-каталіцкай духоўнай акадэміі ў Санкт-Пецярбургу. Падчас вучобы ў Акадэміі малады чалавек прымаў актыўны ўдзел у дзейнасці існаваўшага там гуртка беларускіх студэнтаў.

Беларускі гуртох студэнтаў рымска-каталіцкай акадэміі ў Санкт-Пецярбургу быў заснаваны ў кастрычніку 1913 г. і дзейнічаў на працягу 5 гадоў, аж да закрыцця Акадэміі савецкімі ўладамі ў 1918 г. У будучым многія з удзельнікаў гуртка сталі вядомымі беларускімі рэлігійнымі, грамадскімі і культурнымі дзеячамі: Вінцэнт Гадлеўскі, Андрэй Цікота, Адам Станкевіч, Віктар Шутовіч, Карл Лупіновіч і інш. Усяго ў гуртке было 11 чалавек (для параўнання: у Акадэміі ў той час вучылася 70 студэнтаў)[6]. Узначальваў яго вядомы дзеяч беларускай куль-



*Імператарская Мітрапалітальная Рымска-Каталіцкая духоўная акадэмія ў Санкт-Пецярбургу. Фота 1914 г.*

[6] *Конан* У. Ксёндз Адам Станкевіч і каталіцкае адраджэнне ў Беларусі. Мінск, 2003. С. 13.



*Удзельнікі беларускага гуртка ў Імператарскай Мітрапалітальнай Рымска-Каталіцкай духоўнай акадэміі на пачатку 1917 г. Злева направа: Міхал Пятроўскі, Антон Матвейчык, Андрэй Цікота, Антон Неманцэвіч, Карл Лупіновіч, Адам Станкевіч*

туры, навуковец прафесар Браніслаў Эпімах-Шыпіла.

Галоўнай мэтай гуртка было вывучэнне гісторыі і культуры Беларусі. Дзеля гэтага былі створаны секцыі гісторыі, літаратуры, беларускай песні, сабраная багатая бібліятэка, арганізоўваліся сходы, лекцыі, дыскусіі, літаратурныя вечарыны, канцэрты і г. д.



На паседжаннях акадэмічнага гуртка прысутнічалі не толькі навучэнцы акадэміі, але і свецкія асобы (Б. Тарашкевіч, Т. Грыб)[7], а яго ўдзельнікі выступалі з дакладамі. Так, В. Гадлеўскі выступаў з дакладам на тэму «Аб нацыянальным характары беларусаў», А. Станкевіч — «Аб беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці» і «Аб паэзіі Якуба Коласа». Выступленне А. Неманцэвіча на адным з паседжанняў гуртка было прысвечана уніі[8]. Выбар такой тэмы, трэба меркаваць, сведчыць аб тым, што ўжо падчас вучобы ў Акадэміі Неманцэвіч цікавіўся гісторыяй Берасцейскай царкоўнай уніі і праблемай хрысціянскага адзінства.

7 *Конан* У. Ксёндз Адам Станкевіч і каталіцкае адраджэнне ў Беларусі. Мінск, 2003. С. 13.

8 *Трацяк* І. І. Беларускае каталіцкае духавенства ля вытокаў сацыякультурнай ідэнтыфікацыі. Гродна, 2013. С. 200–202.

Да сённяшняга часу захаваўся фрагмент статуту гуртка, у якім вызначаліся асноўныя накірункі яго дзейнасці, а таксама паводзіны і абавязкі яго членаў. Гэты фрагмент дае пэўнае ўяўленне аб тым, на якія прынцыпы арыентаваўся Антон Неманцэвіч падчас сваёй вучобы ў Рыма-Каталіцкай духоўнай Акадэміі. Прывядзем гэты фрагмент:

§ III. Разумнае і сістэматычнае шырэнне беларускіх твораў.

§ IV. Ціхае яднанне прыхільнікаў, не ўступаючы ў гарачыя дыспуты і не дражнячы праціўнікаў, бо з праціўнікаў яны могуць стацца заклятымі непрыяцелямі.

§ V. Сцерагчыся зразіць іх да мовы.

§ VI. Не думаю заводзіць беларускай мовы ў касцёле фармальна, пакуль не зменяцца цяперашнія варункі і пакуль народ не станецца ўсвядомленым.

§ VII. Буду старацца прыгатаваць народ да скарыстання з спадзяваных лепшых варункаў, каб ён сам зажадаў сваёй мовы ў касцёле і школе.

§ VIII. Не буду сеяць нянавісці да іншых народаў, а такжа між беларусамі каталікамі і праваслаўнымі (...).

§ XI. Буду памагаць сваёй працай і сваім дабром развіццю беларускай каталіцкай літаратуры і пісьменства.

§ XII. Буду рабіць усё ў духу хрысціянскім і каталіцкім, вучачы братоў любіць сваё і паважаць чужое; буду працаваць з верай, надзеяй і міласцю ў сэрцы, буду ісці з воклічам на вуснах: «з Богам для народу»[9].

Удзельнікі акадэмічнага гуртка падтрымлівалі кантакты з суайчыннікамі, якія вучыліся ў той час у Пецярбургскім універсітэце, займаліся выхаваннем у нацыянальным духу

[9] *Туронак* Ю. Падрэзаныя крылы // Рэжым доступу: http://media.catholic.by/nv/n24/art8.htm. – Дата доступу: 4.02.2018.

беларускіх рыма-каталіцкіх семінарыстаў, якія вучыліся ў сталіцы Расійскай імперыі. Беларускі гурток існаваў на працягу пяці гадоў, да таго моманту, калі ў 1918 г. Акадэмія была зачынена савецкімі ўладамі. У траўні таго ж 1918 г. А. Неманцэвіч скончыў Акадэмію, атрымаўшы ступень ліцэнцыята тэалогіі[10].

10 *Usoszyn* J. Życie i działalność o. Antoniego Niemancewicza... C. 8.

## Святар. Душпастырская праца

Яшчэ ў перыяд вучобы ў Акадэміі, 27 верасня 1915 г. Антон Неманцэвіч быў пасвечаны ў сан святара арцыбіскупам Янам Цапляком.

Ян Цапляк (1857–1926) — рыма-каталіцкі арцыбіскуп, у красавіку 1919 г., пасля арышту мітрапаліта Эдварда Ропа, прыняў на сябе кіраванне Магілёўскай архідыяцэзіяй у якасці Апостальскага Адміністратара. У 1923 г. быў арыштаваны бальшавікамі, абвінавачаны ў контррэвалюцыйнай дзейнасці, супрацьдзеянні дэкрэтам аб нацыяналізацыі царкоўнай маёмасці і інш., і прысуджаны да расстрэлу. Пад ціскам сусветнай грамадскасці расстрэл быў заменены на 10-гадовы тэрмін зняволення. У 1924 г. арцыбіскуп Цапляк быў вызвалены, вывезены на расійска-латвійскую мяжу і дэпартаваны ў Латвію. Адтуль ён выехаў у Польшчу, потым у Рым. Памёр у 1926 г., пахаваны ў храме Св. Станіслава ў Вільні. У 1952 г. пачаўся яго беатыфікацыйны працэс.

Вядома, што ў той час Неманцэвіч таксама працаваў выкладчыкам рэлігіі.

У перыяд 1917–1918 гг. малады святар з'яўляўся адміністратарам каталіцкага храма Маці Божай Кармеліцкай ў Гатчыне, рэктарам (настаяцелем) капліцы Св. Апостала

Пятра ў пасёлку Сіверскі Петраградскай губерні (цяпер Ленінградская вобласць Расійскай Федэрацыі), дзе кіраваў камісіяй па будаўніцтве мясцовага каталіцкага храма. У 1918–1921 гг. а. Неманцэвіч быў пробашчам парафіі Св. Пятра і Паўла ў Колпені паблізу Петраграда, якая налічвала 2200 вернікаў (цяпер Колпіна — гэта адзін з раёнаў Санкт-Пецярбурга) і пробашчам капліцы ў Макараве (цяпер Чырвоны Бор), якая адносілася да Колпенскай парафіі. У верасні таго ж 1918 г. царкоўныя ўлады прызначылі яго вікарыем каталіцкага храма Св. Станіслава ў Петраградзе (колькасць вернікаў гэтай парафіі ў 1917 г. складала больш за 10 тысяч чалавек)[11].



*Касцёл Св. Станіслава ў Санкт-Пецярбургу. Сучасны выгляд*

[11] *Usoszyn J.* Życie i działalność o. Antoniego Niemancewicza... С. 9–10; *Маракоў Л. У.* Рэпрэсаваныя каталіцкія духоўныя, кансэкраваныя і свецкія асобы Беларусі (1917–1964). С. 307.

Вядома, што ў тыя часы Неманцэвіч прыняў удзел у адным з дыспутаў на тэму рэлігіі. Ён разам з вядомым праваслаўным святаром-абнаўленцам А. Баярскім прадстаўляў пазіцыю вернікаў, а іх апанентамі з'яўляліся савецкія атэісты, сярод якіх быў і тагачасны наркам асветы РСФСР А. Луначарскі. Дыспут скончыўся перамогай А. Неманцэвіча і А. Баярскага. Пасля дыспуту адзін з бальшавікоў спытаў А. Баярскага: «Чаму вы выступалі салідарна з каталіцкім святаром, калі вы між сабой таксама вядзеце барацьбу?». На гэта А. Баярскі адказаў наступнае: «так, у нас ёсць рознагалоссі і спрэчкі, але гэта наша сямейная справа. Калі мы бачым сямейнага ворага, мы разам выступаем для барацьбы з ім»[12].

У касцёлах Петраграда і яго ваколіцаў малады святар выкладаў рэлігію дзецям, а таксама прапагандаваў сярод мясцовага насельніцтва ідэю хрысціянскай еднасці і аб'яднання Каталіцкай і Праваслаўнай цэркваў[13]. Экзарх расійскіх грэка-католікоў Л. Фёдараў у сваім лісце да галіцкага грэка-каталіцкага мітрапаліта А. Шэптыцкага пісаў, што сярод беларускіх рыма-каталіцкіх святароў ёсць тыя, хто з'яўляецца прыхільнікам уніі і гатовы прыняць усходні абрад. Да шэрагу гэтых святароў ён аднёсіў і айца Антона Неманцэвіча[14].

12 *Гарошка Л.* Антон Неманцэвіч // Божым шляхам. 1956. № 70–75. С. 50; *Usoszyn J.* Życie i działalność o. Antoniego Niemancewicza… С. 10.

13 *Маракоў Л. У.* Рэпрэсаваныя каталіцкія духоўныя, кансэкраваныя і свецкія асобы Беларусі. С. 307.

14 *Гаек С., архім., Усошын Я., дыякан.* Экзарх Антон Неманцэвіч — верны сьведка Евангельля. Колькі слоў пра ягонае духоўнае служэнне // Roczniki Teologiczne. Tom LIII–LIV, zeszyt 7 — 2006–2007. С. 156; Бурман В. Леонид Фёдоров. Жизнь и деятельность. http://www.krotov.info/history/20/tarabuk/burman04.html. Дата доступа: 18.12.2017.



*Эдвард фон дэр Роп (1851–1939) – рыма-каталіцкі арцыбіскуп. У 1904–1907 гг. узначальваў Віленскую дыяцэзію. Заснавальнік Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі (1906 г.). Арцыбіскуп-мітрапаліт Магілёўскі ў 1917–1931 гг. За пратэсты супраць нацыяналізацыі маёмасці Рыма-Каталіцкай царквы бальшавікамі ў 1919 г. быў арыштаваны, потым высланы ў Польшчу, дзе працягваў сваё царкоўнае служэнне.*

Руплівае служэнне а. Неманцэвіча выклікала негатыўную рэакцыю з боку савецкай улады. 25 мая 1919 г. ён упершыню быў арыштаваны за ўдзел у каталіцкай дэманстрацыі супраць арышту мітрапаліта Э. Ропа і шэсць месяцаў правёў у турме.



*Арцыбіскуп Ян Цепляк*

У другі раз Неманцэвіча арыштавалі ў 1921 г. за ўдзел у акцыі пратэсту рыма-каталікоў супраць арышту ўладамі арцыбіскупа Я. Цапляка. Айцец Антон некалькі месяцаў утрымліваўся ў турме «Кресты» у Петраградзе, пасля чаго быў перавезены ў Маскву і там вызвалены[15].

Пасля вызвалення Неманцэвіч быў прызначаны вікарыем парафіі св. Пятра і Паўла

[15] *Гарошка Л.* Антон Неманцэвіч // Божым шляхам. – 1956. – № 70-75. – С. 50.

ў Маскве[16]. Па некаторых дадзеных, ён таксама займаўся душпастырскай дзейнасцю сярод каталікоў у Разані.

Відавочна, што харызматычны каталіцкі святар не задавальняў улады, там на волі ён доўга не прабыў. Летам 1923 г.[17] (па іншым дадзеным у 1924 г.)[18] улады арыштавалі айца Антона Неманцэвіча за выкладанне моладзі асноваў рэлігіі. Святар атрымаў 3 гады турмы, вядома, што ў 1924 г. ён знаходзіўся ў Іванаўскім лагеры пад Масквой. У турэмным зняволенні ён прабыў да пачатку 1925 г., калі ў выніку абмену палітвязнямі 1 лютага 1925 г. быў перададзены польскаму боку.

Мітрапаліт Эдвард Ропп накіраваў яго на вучобу ў Рым, дзе ў Папскім Ўсходнім Інстытуце (Русікуме) айцец Антоній вывучаў багаслоўе[19]. 2 ліпеня 1927 г. ён паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «*Бальшавізм і выхаванне. Сучаснае бальшавіцкае заканадаўства ў Расіі, якое датычыць рэлігійнага і маральнага выхавання моладзі ў святле Божага Закона, натуральнага і аб'яўленага*» і атрымаў ступень доктара ўсходніх навук. Навуковым кіраўніком дактарату Неманцэвіча з'яўляўся вядомы езуіт Мішэль Д'Эрбіны[20], у будучым кіраўнік камісіі «Pro Russia». На жаль, гэтая праца Неманцэвіча да сённяшняга часу застаецца практычна невядомай, у тым ліку і прафесій-

16 *Маракоў Л. У.* Рэпрэсаваныя каталіцкія духоўныя, кансэкраваныя і свецкія асобы Беларусі. С. 307.

17 Там жа.

18 *Usoszyn J.* … S. 11.

19 *Гаек С., архім., Усошын Я., дыякан.* Экзарх Антон Неманцэвіч — верны сьведка Евангельля. Колькі слоў пра ягонае духоўнае служэнне. С. 156; *Чаплицкий Б., Осипова И.* Книга памяти: Мартиролог Католической церкви в СССР. М., 2000. С. 124.

20 *Гарошка Л.* Антон Неманцэвіч. С. 50. *Usoszyn J.* … S. 9.


Русікум

ным даследчыкам. Магчыма, Д'Эрбіны паўплываў на далейшае жаданне святара стаць езуітам.

Пасля заканчэння вучобы айцец Антоній некаторы час працаваў асістэнтам прэфекта бібліятэкі Папскага Ўсходняга Інстытута. Пасля гэтага ён пераехаў у Польшчу, дзе ў перыяд з 1928 па 1929 гады выкладаў гісторыю царквы і так званыя ўсходнія царкоўныя навукі ў Місіянерскім Інстытуце ў Любліне, параўнальнае багаслоўе на тэалагічным факультэце Каталіцкага універсітэта Любліна (КУЛ). Крамя таго, ён працаваў яшчэ і школьным прэфектам[21]. Верагодна, ён таксама быў душпастырам у неауніяцкай парафіі каля Замосця[22]. Аднак выкладчыцкая дзейнасць А. Неманцэвіча ў Любліне цягнулася адносна нядоўга. На гарызонце яго жыцця ўжо паўставаў новы, зусім іншы, значна больш складаны, але і самы дзейсны этап, які скончыўся мучаніцкай смерцю святара.

21 *Маракоў Л.У. ... С. 308.*
22 *Usoszyn J. ... S. 12.*

# Альбярцін

А. Неманцэвіч жадаў прысвяціць сябе служэнню сярод беларускага народа па распаўсюджванню уніі. Аб Усходняй місіі айцоў-езуітаў, што дзейнічала на тэрыторыі Заходняй Беларусі, ён мог даведацца падчас сваёй вучобы ў Рыме (езуіты тады кіравалі Папскім Усходнім інстытутам). У пачатку верасня 1929 г. ён прыязджае ў Альбярцін і уступае ў навіцыят (13 верасня 1929 г.)[23].

Альбярцін (цяпер адзін з раёнаў г. Слонім) узнік у першай палове XIX стагоддзя як сядзіба маршалка шляхты Слонімскага павета В. Пуслоўскага (1762–1833). У міжваенны час гэта было мястэчка ў 4 км ад Слоніма, мясцовае праваслаўнае насельніцтва якога захавала прыхільнасць да некаторых традыцый уніі. Езуіты з'явіліся ў Альбярціне ў 1923 г. Восенню 1924 года там быў адчынены манастыр усходняга абраду. Граф Пуслоўскі ахвяраваў ім зямлю і будынак былой фабрыкі. У ліпені 1925 г. Альбярцінская місія езуітаў першай у Заходняй Беларусі атрымаў статус парафіі візантыйска-славянскага абрада. У 1926 г. пры манастыры быў заснаваны навіцыят, пасля заканчэння якога можна было працягваць навучанне ў Кракаве, Любліне

[23] *Гарошка Л.* Антон Неманцэвіч. С. 50.

і нават у Рыме. Адзін з арганізатараў навіцыяту, француз Філіп дэ Режы ў 1933 г. быў выкліканы ў Рым, дзе стаў духаўнікам, а ў 1934 г. — рэктарам Папскага Ўсходняга Інстытута (Русікума). Альбярцін з'яўляўся адной з самых моцных і шматлікіх парафій усходняга абраду на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны час. Да яе належылі вернікі з усяго Слонімскага павету. Калі ў 1927 г. парафія налічвала каля 200 веруючых, то ў 1939 г. — ужо каля 740. Альбярцін неаднаразова наведвалі тагачасныя іерархі Каталіцкай царквы — біскупы З. Лазінскі, К. Букраба, Р. Ялбжыкоўскі, Папскі нунцый у Варшаве арцыбіскуп Ф. Мармаджы, Апостальскі візітатар візантыйска-славянскага абраду біскуп Мікалай Чарнецкі[24].

У навіцыяце Альбярціна айцец Антон Неманцэвіч правёў два гады (да 1932 г.), спасцігаючы манаскае жыццё і езуіцкую духоўнасць[25], пасля чаго стаў манахам Ордэну езуітаў. Па заканчэнні навіцыяту у тым жа 1932 г. ён быў прызначаны пробашчам парафіі ў Альбярціне[26].

Вядома таксама, што Антон Неманцэвіч у сваёй душпастырскай дзейнасці карыстаўся беларускай мовай — мовай большасці яго паствы, прамаўляў па-беларуску казанні. Польскія ўлады адзначалі, што «*отцы Альбертинцы, проводя работу среди белорусов, не препятствуют распространению среди них идей белорусского национализма...и даже независимого государства...*»[27]. Разам з тым, Антон Неманцэвіч цураўся палітыкі — невядома нівод-

[24] *Свирид А. Н.* Униатская церковь в Западной Беларуси (1921–1939 гг.). Брест, 2012. С. 127–128.
[25] *Гаек С., архім., Усошын Я., дыякан.* ... С. 156.
[26] *Usoszyn J.* ... S. 13.
[27] *Свирид А. Н.* Униатская церковь в Западной Беларуси. С. 87–88.

нага яго выказвання, якое можна было б расцэньваць як палітычнае. У адрозненні ад шэрагу іншых святароў, што неслі сваё служэнне ў Заходняй Беларусі і прымалі ўдзел у грамадска-палітычнай дзейнасці, ён не ўваходзіў у склад партый і рухаў. Ён адзначаў, што «цяперашняя Унія ня мае на мэце нейкіх палітычных выгад, а толькі рэлігійныя – аб'ядналньне хрысціянаў»[28].



*Езуіты ўсходняга абраду ў Альбярціне. Канец 1920-х гадоў.*



*Айцы-езуіты ў Альбярціне. Пачатак 1930-х гадоў.*

[28] *Гаек С., архім., Усошын Я., дыякан.* С. 158–159.



*Грэка-каталікі ў Альбярціне.*
*У трэцім радзе другі справа Антон Неманцэвіч, 1935 год.*



ALBERTYN. — Nowa cerkiew i dom od ogrodu.



ALBERTYN. — Nowa cerkiew wschodnia i klasztor od frontu.



*Царква ўсходняга абраду ў Альбярціне. Унутраны інтэр'ер. 1930-я гг.*


ALBERTYN. — Ołtarz w cerkwi z obrazem zaołtarzowym.

У жніўні 1933 г. айцец Антон Неманцэвіч быў прызначаны настаяцелем парафіі Перамянення Гасподняга ў вёсцы Сынкавічы, што прыкладна за 12 км ад Слоніма (цяпер Зэльвінскі раён Гродзенскай вобласці),

Неманцэвіч актыўна займаўся душпастырскай працай. Вядомы наступны факт: за адзін толькі калядны тыдзень 1933 г. айцец Антон наведаў каля 600 сем'яў, што адносіліся да гэтай парафіі. Асаблівую ўвагу ён надаваў будучыні любой царквы — дзецям і моладзі[29]. Аднак у Сынковічах ён прабыў нядоўга — праз год яго перавялі на пасаду прафесара Папскай Усходняй семінарыі ў Дубна (цяпер Роўненская вобласць Украіны), дзе ён выкладаў тэалогію і кананічнае права[30]. Адначасова з выкладчыцкай дзейнасцю ён з'яўляўся настаяцелем дома езуітаў у Дубне і займаўся душпастырскай працай у парафіях усходняга абраду на Валыні, праводзіў духоўныя практыкаванні (рэкалекцыі)[31]. Аднак ён не спыняў кантактаў з вернікамі і духавенствам у Заходняй Беларусі. Падчас свайго летняга адпачынку Неманцэвіч наведваў прыходы візантыйска-славянскага абраду ў Заходняй Беларусі, дзе па-ра-

29 *Usoszyn J.* ... S. 13.
30 *Маракоў Л. У.* С. 308.
31 Там жа; *Usoszyn J.* ... S. 14.



ALBERTYN. — Obraz Matki B. w sali nowicjackiej.

нейшаму прамаўляў казанні на беларускай мове[32].

У 1930-я гг. у Пінску праводзіліся ўніяцкія канферэнцыі духавенства, мэтай якіх з'яўлялася больш глыбокае пазнанне хрысціянскага Усходу, яго гісторыі і культуры, а таксама абмеркаванне праблем і цяжкасцяў развіцця нэаўніі. Айцец Антоній як сакратар прымаў удзел у гэтых канферэнцыях у 1933, 1935 і 1937 гг., выступаў там з дакладамі[33]. У прыватнасці, ён абвяргаў абвінавачванні ў тым, што нэаўнія з'яўляецца сродкам для русіфікацыі мясцовага насельніцтва. Неманцэвіч падкрэсліваў, што Каталіцкая царква з'яўляецца маці для ўсіх народаў і не можа служыць аднаму народу за кошт іншага. У сваіх выступленнях ён аналізаваў становішча неаўніі на тэрыторыі II Рэчы Паспалітай, існаваўшыя праблемы, уплыў рымска-каталіцкага духавенства на далейшае развіццё ўніяцкай царквы і магчымую дапамогу з яго боку[34].

Дзейнасць Айца Неманцэвіча, як, дарэчы, і іншых уніяцкіх святароў у Заходняй Беларусі, праходзіла ў складаных умовах, сутыкалася з неразуменнем і прадузятасцю не толькі з боку праваслаўных, але таксама і рыма-каталі-

[32] Гарошка Л. Антон Неманцэвіч. С. 51.
[33] *Usoszyn J.* ... S. 38.
[34] Там жа. S. 39.

коў. Так, у 1933 г. у Слоніме рыма-каталіцкая моладзь не хацела пускаць а. Неманцэвіча ў мясцовы касцёл для правядзення набажэнства па ўсходнім абрадзе[35]. Неаднозначна ставіліся да дзейнасці ўніяцкіх святароў польскія ўлады, як на мясцовым, так і на дзяржаўным узроўні[36].

Каля 1940 г. айцец А. Неманцэвіч з Дубна зноў вярнуўся ў Альбярцін[37], дзе і сустрэў пачатак Другой Сусветнай вайны.



*Альбярцін. Побач з касцёлам крыж памяці айцоў-езуітаў.*




---

35 *Загідулін А. М.* Беларускае пытанне ў польскай нацыянальнай і канфесійнай палітыцы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.). Гродна, 2010. С. 124.

36 Падрабязней гл.: *Свирид А. Н.* Униатская церковь в Западной Беларуси. С. 90–102.

37 *Usoszyn J.* ... S. 15.

# «Да Злучэньня»

У 1932 г. Антон Неманцэвіч стаў рэдактарам часопіса «Да Злучэньня», які быў заснаваны і выдаваўся айцамі-іезуітамі з Альбярціна.

Часопіс «Да Злучэньня» з'яўляўся адзіным беларускамоўным ўніяцкім перыядычным выданнем ў Заходняй Беларусі. Іншыя ўніяцкія часопісы выдаваліся на расійскай (віленскі часопіс «К соединению») і польскай («Oriens») мовах. Вакол часопіса «Да Злучэньня» гуртаваліся беларускія уніяцкія святары, а таксама прыхільнікі ўніі з ліку беларускіх рымска-каталікоў, свецкія асобы. Яго аудыторыяй з'яўляліся не толькі вернікі-ўніяты, але ўвесь беларускі народ[38]. Выдаваўся часопіс штомесячна.

Першы нумар часопіса «Да злучэньня» пабачыў свет у студзені 1932 г., а за ўвесь час яго існавання выйшла 60 нумароў[39]. У ім рэгулярна публікаваліся вядомыя святары Б. Пачобка, Я. Германовіч, Я. Урбан і інш. Сам айцец Антон Неманцэвіч быў аўтарам шматлікіх артыкулаў, якія

---

38 *Усошын Я.* Ідэйныя пастулаты неаўнійнага руху паводле праграмнага рэдакцыйнага артыкула ў часопісе «Да Злучэньня» (№ 1 за 1932 г.). Рэжым доступу: http://churchby.info/bel/466. Дата доступу: 25.01.2017.

39 *Бабкін Г.* Да Злучэння // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 3. Мінск, 1996. С. 184.




выходзілі як пад яго уласным прозвішчам, так і пад псеўданімам «Злучэнец». Адзначым, што крамя таго Антон Неманцэвіч пісаў артыкулы і для іншых выданняў, напрыклад, для «Беларускага каляндара», што выходзіў у той час у Вільні[40].

Галоўнай мэтай часопіса «Да злучэння» з'яўлялася папулярызацыя ў беларускім грамадстве ідэі царкоўнай еднасці і садзейнічанне рэалізацыі гэтай ідэі. Ужо ў праграмным артыкуле «Ад рэдакцыі», змешчаным у першым нумары, аўтарам якога, магчыма, был сам Антон Неманцэвіч, еднасць хрысціянаў называлася «*найвялікшым і найглыбейшым пажаданнем*» Ісуса Хрыста. Рэдакцыя тлумачыла выданне часопіса так: «*Вось, браты Беларусы, дзеля таго, каб служыць гэтай сьвятой справе, справе нашай рэлігійнай еднасьці і каб бараніць яе ад напасьцяў нашых няпрыхільнікаў, мы і закладаем наш часопіс* «Да Злучэньня», *да заклікаем усіх людзей добрай волі да Сьвятога Апостальства ў гэтым жа кірунку*»[41].

Адсутнасць у беларускім грамадстве рэлігійнага адзінства разглядалася ў якасці прычыны яго раз'яднанасці і перашкоды на шляху да яго кансалідацыі. Крытыкавалася

[40] *Гарошка Л.* Антон Неманцэвіч. С. 51.
[41] Ад рэдакцыі // Да Злучэньня. Студзень 1932. № 1. С. 5.

існаваўшае ў той час перакананне, што каталіцызм — гэта «*польская*» вера, а праваслаўе — «*руская*» вера. На думку рэдакцыі часопіса «Да злучэння», «*Хай жа Беларус ведае, што няма ані польскай, ані рускай веры. Хай не мяшае народнасьці з рэлігіяй. Ці Беларус праваслаўны, ці каталік, ён заўсёды Беларус*»[42]. Разам з тым, галоўнай лічылася рэлігійная еднасць, а еднасці нацыянальнай надавалася другаснае значэнне, як вынік здзяйснення словаў Хрыста «*Шукайце насамперш Каралеўства Божага, а ўсё астатняе дадасца вам*» (Мф. 6:33).

Адзінства хрысціянаў бачылася ў межах Каталіцкай царквы, якая называлася адзінай Хрыстовай царквой, іншымі словамі, у форме уніі. Адпаведна, ліквідацыя расійскімі ўладамі Уніяцкай царквы ў 1839 г. ацэньвалася негатыўна. На думку рэдакцыі, гэтая падзея паслужыла перадумоваю рэлігійнага расколу беларускага грамадства, прывяла да адыходу вялікай часткі беларусаў «*ад народа, як цэласці, ад свае бацькаўшчыны*»[43].

У часопісе друкаваліся ўрыўкі з чарговых нядзельных чытанняў Евангелля згодна календару Ўсходняй царквы, катэхетычныя апавяданні, артыкулы, прысвечаныя хрысціянскаму веравучэнню і гісторыі царквы. На яго старонках асвятляўся і працэс развіцця неаўніі, абмяркоўваліся шляхі і метады яе далейшага распаўсюджвання. Часопіс палемізаваў з праціўнікамі ўніі як з боку каталікоў, так і праваслаўных, абвяргаў памылковыя трактоўкі каталіцкіх дактрын і тлумачыў іх сапраўдны сэнс. Так, у першым нумары «Да Злучэньня» Неманцэвіч у сваім артыкуле тлумачыў, у чым у сапраўднасці заключаецца вучэнне аб Папе

42 Там жа. С. 3.
43 Ад рэдакцыі // Да Злучэньня. Студзень 1932. № 1. С. 4.

Рымскім як заступніку Хрыста на зямлі[44]. Існавала ў часопісе і асобная дзіцячая рубрыка пад назвай «Куток для дзяцей». Напрыканцы часопіса змяшчаўся царкоўны каляндар на месяц са святамі Ўсходняй царквы (па юліянскаму календару) і Заходняй (па грыгарыянскаму календару).

Значэнне часопіса «Да Злучэньня» ў адраджэнні і развіцці ўніі на тэрыторыі Заходняй Беларусі можна параўнаць са значэннем газеты «Наша ніва» ў развіцці беларускай нацыянальнай самасвядомасці і культуры ў пачатку XX ст.

Часопіс «Да Злучэньня» спыніў сваё існаванне ў 1937 г. па прычыне адмоўнага стаўлення польскіх уладаў да яго як да беларускамоўнага выдання[45]. Аднак у 1938 г.[46] (па другім дадзеным, у пачатку 1939 г.)[47] ужо ў Варшаве А. Неманцэвіч арганізаваў выданне новага часопіса пад назвай «Злучэньне» лацінскім шрыфтам. Цікава, што ў гэтым яму дапамагалі студэнты-беларусы, сярод якіх амаль усе былі праваслаўнымі[48]. Выхад чарговых нумароў спыніў пачатак Другой сусветнай вайны.

Адзначым, што да сённяшняга часу нумары часопіса «Да Злучэньня» (за выключэннем першага нумара) і «Злучэнне» не адлічбаваныя і маладаступныя як для даследчыка, так і для зацікаўленага чытача, аб чым застаецца толькі шкадаваць.

44 Там жа. С. 11–14.
45 *Гарошка Л.* ... С. 51.
46 *Маракоў Л. У.* ... С. 308.
47 *Гарошка Л.* ... С. 51.
48 Там жа.

# Апостальскі Экзарх для Беларусі

Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР парафіі візантыйска-славянскага абраду аказаліся ў цяжкім стане. Частка з іх была ліквідавана, а тыя, што захаваліся, знаходзілася пад пастаяннай пагрозай ліквідацыі з-за немагчымасці выплаты вялікіх падаткаў, якімі іх абклала савецкая ўлада[49]. Мы не маем звестак аб колькасці ўніяцкіх парафій і вернікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў перыяд 1939–1941 гг. Згодна даследаванню В. Пануцэвіча, напярэдадні Другой Сусветнай у Віленскай мітраполіі было 4 парафіі, 7 святароў і каля 3.500 вернікаў; у Пінскай епархіі — 12 святароў і каля 7.000 вернікаў; на Падляшшы — 10 святароў, 2 дыяканы і каля 5.000 вернікаў; у Альбярціне — каля 50 місіянераў (айцоў і братоў) езуітаў і каля 1.000 чалавек парафіянаў[50]. З іншага боку, трэба ўлічваць, што дакладнай статыстыкі колькасці ўніяцкіх парафій і вернікаў ў Заходняй Беларусі ў міжваенны час не існуе. А. Н. Свірыд лічыць адпаведныя дадзеныя адносна Альбярціна завышанымі

49 *Гарошка Л.* Антон Неманцэвіч. С. 51.

50 *Волаціч М. (Вацлаў Пануцэвіч).* Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква // Запісы БІНІМ. 2004. Т. 27. Рэжым доступу: http://www.belapc.org/litaratura/mikola-volacic-vaclau-panucevic---belaruskaa-autakefalnaa-pravaslaunaa-carkva. Дата доступу: 11.02.2018.

і адзначае, што ў 1938 г. там было толькі 3 святара-езуіта, 5 братоў і 5 клірыкаў навіцыяту[51].

Улічваючы ліквідацыю часткі парафій савецкай уладай, савецкую антырэлігійную прапаганду і пераслед вернікаў, безумоўна, уніяцкая царква на заходнебеларускіх землях была значна аслаблена. Вядома, што манастыр езуітаў у Альбярціне спыніў сваю дзейнасць пасля ўсталявання савецкай улады[52], а будынак уніяцкага храма быў пераўтвораны ў кінатэатр[53].

9 кастрычніка 1939 года галіцкі грэка-каталіцкі мітрапаліт Андрэй Шаптыцкі з мэтай умацавання ўніяцкай царквы і яе далейшай місіі стварыў чатыры ўсходне-каталіцкія Экзархаты, у тым ліку і Экзархат для Беларусі. Ён павінен быў уключаць не толькі беларускія землі, але ж і тэрыторыі Літвы, Латвіі і Эстоніі, разам з тым яго межы не былі дакладна вызначаны[54].

Стварэнне асобнай царкоўнай структуры — Экзархату для Беларусі мела важнае значэнне для далейшага развіцця ўніяцкай царквы на беларускіх землях. Тым самым упарадкоўваўся статус уніяцкіх парафій і адкрывалася перспектыва таго, што ў далейшым яны будуць выведзены з юрысдыкцыі рыма-каталіцкіх біскупам і атрымаюць свайго біскупа (тытул экзарха звычайна адпавядаў біскупскаму сану). З'яўленне асобнага экзархату азначала

---

51 *Свирид А. Н.* Униатская церковь в Западной Беларуси. С. 115.

52 *Довідка про діяльність католиків у західних областях України і Білорусі та в Естонії, 1 листопада 1940 року* // Митрополит Андрей Шептицький у документах радянських органів державної безпеки (1939–1944 рр.). К., 2005. С. 208.

53 *Usoszyn J.* ... S. 15.

54 Там жа. С. 49–50.

таксама з'яўленне цэнтру, які мог бы займацца каардынацыяй душпастырскай дзейнасці сярод грэка-католікаў.

Мітрапаліт Шаптыцкі, прымаючы рашэнне аб стварэнні экзархатаў, дзейнічаў на падставе паўнамоцтваў былых кіеўскіх уніяцкіх мітрапалітаў, якія ён атрымаў ад Папы Пія X яшчэ ў 1908 г. і згодна якім яго адміністрацыйная ўлада распаўсюджвалася на беларускія землі.

Часовым кіраўніком Экзархату для Беларусі быў прызначаны біскуп Мікалай Чарнецкі, які з 9 кастрычніка 1939 па 17 верасня 1940 года выконваў абавязкі Апостальскага Экзарха для беларускіх грэка-католікаў. У 1940 г. замест М. Чарнецкага Апостальскім Экзархам стаў айцец Антон Неманцэвіч[55]. Прызначэнне Неманцэвіча зацвердзіў Папа XII 22 лістапада 1941 г.[56] У сваім пасланні да Шаптыцкага Папа назваў Неманцэвіча «апостальскім экзархам (апостальскім адміністратарам) верных усходняга абраду на Беларусі ad nutum Sanctae Sedis»[57]. Згодна з рашэннем Святога Пасаду Шэптыцкі быў прызначаны Дэлегатам Апостальскай Сталіцы, якому экзархі павінны былі даваць справаздачу па найважнейшых справах сваёй дзейнасці і атрымліваць ад яго інструкцыі[58].

55 *Лист УГК Екзархів до секретаря Східної конгрегації Євгена Тіссерана про рішення розпочати унійну працю на території Радянського Союзу* // Митрополит Андрей Шептицький. Церква і церковна єдність: документи і матеріали, 1899–1944. Т. I. Львів: Свічадо, 1995. С. 357.

56 *Папа Пій XII 22 листопада 1941 року потвердив встановлення чотирьох екзархатів* // Богословія. Т. 44. Рим, 1980. С. 172.

57 *Usoszyn J.* ... S. 52–53.

58 *Хома І.* Собори екзархів у Львові 1940–1941 // Богословія. Т. 44. Рим. 1980. С. 140; Usoszyn J. ... S. 54.



*Мітрапаліт Галіцкі Андрэй Шаптыцкі*

Атрыманне падобнай царкоўнай пасады ў тагачасных умовах стварала для яе ўладальніка вялікую небяспеку быць як мінімум зняволеным савецкай уладай. Як пісаў святар Л. Гарошка, «*новае становішча а. Антона было спалучана не толькі з вялікімі цяжкасцямі, але вымагала таксама заўсёднай гатоўнасці да найбольшых ахвяраў*»[59]. Напэўна разумеючы, што ў выніку яго арышту Экзархат будзе абезгалоўлены, а таксама з мэтай больш эфектыўнага кіраўніцтва захаваўшыміся ўніяцкімі абшчынамі, А. Неманцэвіч адразу прызначыў дзвух намеснікаў: святароў Л. Гарошку і В. Аношку[60].

Існаванне Экзархата трымалася ў строгай сакрэтнасці і, магчыма, што савецкія ўлады не ведалі пра гэта. У апублікаваных да цяперашняга часу раней сакрэтных дакументах НКУС за перыяд 1939-1940 гг., якія змяшчаюць агляд рэлігійнай сітуацыі ў Заходняй Беларусі, звестак аб стварэнні Экзархату для Беларусі няма, згадваецца толькі пра тое, што А. Шаптыцкі і А. Неманцэвіч праводзяць «*организационную работу*» сярод уніятаў. Варта адзначыць, што самога А. Неманцэвіча НКУС ацэньваў даволі высока, як чалавека «*смелого, обходительного и ловкого*»,

59 *Гарошка Л.* ... С. 51.
60 Там жа.

які «*много работает – проповедует, обслуживает несколько приходов*»[61].

Спробу легалізацыі дзейнасці Беларускага Экзархату Неманцэвіч зрабіў ва ўмовах нямецкага акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 5 студзеня 1942 г.ён звярнуўся з адпаведнай ініцыятывай у нямецкі Генеральны камісарыят у Мінску. Немцы далі сваю згоду толькі 16 сакавіка 1942 г.[62], што, верагодна, сведчыць аб насцярожаным стаўленні з іх боку да беларускіх уніятаў.

На Вялікдзень 5 красавіка 1942 г. Неманцэвіч як Экзарх звярнуўся з пастырскім пасланнем да ўсяго беларускага народа. Тым самым, факт існавання Экзархату стаў вядомы грамадскасці. 2 траўня 1942 г. была створана Рада Экзархату[63], у склад якой увайшлі Л. Гарошка, В. Аношка і І. Гермацюк[64].

Сядзібаю Экзархату стаў Альбярцін, дзе служыў айцец Неманцэвіч. Афіцыйнай мовай Экзархату і мовай казанняў з'яўлялася беларуская мова. Дзейнасць Экзархату адразу сутыкнулася з шэрагам праблем. Па-першае, трэба было вырашыць пытанне царкоўнай юрысдыкцыі ўніяцкіх парафій. Справа ў тым, што ў міжваеннай польскай дзяржаве гэтыя парафіі былі падначалены біскупам лацінскага абраду. Такі стан рэчаў вызначаў канкардат, заключаны паміж урадам Польшчы і Святым Пасадам у 1925 г.

61 *Довідка про діяльність католиків у західних областях України і Білорусі та в Естонії, 1 листопада 1940 року* // Митрополит Андрей Шептицький у документах радянських органів державної безпеки (1939–1944 рр.). К., 2005. С. 209.
62 *Usoszyn J.* ... S. 65.
63 *Гарошка Л.* ... С. 52.
64 *Хома І.* Собори екзархів у Львові 1940–1941. С. 143.

Але ў 1939 г. Польшча як дзяржава перастала існаваць, а стварэнне Экзархату прызнаў Ватыкан. А. Неманцэвіч у новых умовах меў намер пераняць уніяцкія парафіі з-пад улады лацінскіх біскупаў. Віленскі архцыбіскуп Р. Ялбжыкоўскі, які быў вядомы сваім непрыхільным стаўленнем да беларушчыны, тым не менш, пагадзіўся перадаць усе ўніяцкія парафіі на тэрыторыі яго дыяцэзіі ў юрысдыкцыю Беларускага Экзархату. Аналагічна паступіў і Пінскі біскуп Казімір Букраба. Складаней была сітуацыя з парафіямі, што знаходзіліся на тэрыторыі Падляшскай дыяцэзіі. Яе ардынарый Генрык Пшаздзецкі памёр ў 1939 г., новага біскупа Ватыкан не прызначыў, таму вырашэнне гэтага пытання было адкладзена.

Па-другое, перад Экзархатам стаяла кадравая праблема: адчуваўся недахоп святароў. Неманцэвіч сам выконваў адміністрацыйную працу. Яму таксама даводзілася часта і шмат ездзіць, што ва ўмовах акупацыі рабіць было цяжка, паколькі немцы абмяжоўвалі перамяшчэнне невыенных асоб. Падчас паездак Неманцэвіч наведваў беларускіх грамадскіх дзеячаў, таксама ён падтрымліваў актыўныя кантакты з беларускімі арганізацыямі ў Слоніме. Як адзначае Л. Гарошка, А. Неманцэвіч знаходзіў шчырую прыхільнасць не толькі з боку каталікоў, але і праваслаўных[65].

Па-трэцяе, перад Беларускім Экзархатам стаялі арганізацыйныя пытанні. Л. Гарошка адносіць да іх пытанне стварэння духоўнай кансісторыі, выдання рэлігійнай перыёдыкі, богаслужбовых кніг і інш. Аднак большасць з іх было вырашана адкласці да лепшых часоў.

[65] *Гарошка Л.* ... С. 52.

У 1940-1941 гг. з мэтай вырашэння кананічных і практычных пытанняў, звязаных з дзейнасцю створаных экзархатаў, у Львове адбылося тры саборы Экзархаў, у працы двух з якіх прымаў удзел і А. Неманцэвіч[66]. У чэрвені 1942 г. Шаптыцкі звярнуўся да Святога Пасаду з просьбай надаць беларускаму экзарху годнасць архімандрыта[67].

Неабходна акцэнтаваць увагу на самаадданай душпастырскай працы айца А. Неманцэвіча у той час. На пачатку вайны ён дапамагаў праваслаўнаму святару ў вёсцы Чапялёва бліз Альбярціна адпраўляць абрад пахавання ў тых месцах, куды той не мог даехаць. Таксама А. Неманцэвіч наведваў лагер савецкіх ваеннапалонных, якi знаходзіўся ў ваколіцах Слоніма, прычым нават падчас эпідэміі тыфу, што было смяротна небяспечна. Так, святар Ян Гермацюк, які таксама наведваў лагер савецкіх ваеннапалонных, заразіўся і памёр ад тыфу вясной 1942 г.[68].

У пачатку 1942 г. а. Неманцэвіч заснаваў Апостальства малітвы за Беларусь для святароў. Святары, якія ўключыліся ў гэтую ініцыятыву, павінны былі кожны месяц адпраўляць адно набажэнства за беларускі народ. Пазней магчымасць далучыцца да Апостальства была прадастаўлена парафіянам, якія павінны былі штомесяц прымаць Св. Тайны ў інтэнцыі беларускага народа. Экзарх таксама выношваў план арганізацыі місіі сясцёр скрытак[69]

66 Там жа.
67 *Usoszyn J.* ... S. 16.
68 *Гаек С., архім., Усошын Я., дыякан.* Экзарх Антон Неманцэвіч — верны сьведка Евангельля. С. 157.
69 Такой манаскай супольнасці ў Каталіцкай царкве не існуе. Я. Ўсошын выказаў меркаванне, што магчыма маюцца на ўвазе сёстры Зграмаджэння Місіянерак Найдастойнейшага Сэрца Госпада Ісуса. Гл.: *Usoszyn J.* ... S. 56.

у Беларусі, якія займаліся б дзецьмі-сіротамі, прасіў манашак кожны дзень маліцца за Беларускі Экзархат[70].

Утварэнне уніяцкага Экзархату для Беларусі і актыўная дзейнасць А. Неманцэвіча выклікалі незадаволенасць з боку праваслаўных іерархаў, што пражывалі ў перыяд нямецкай акупацыі ў Заходняй Беларусі (мітрапаліт Панцеляймон Ражноўскі, архімандрыт Філіп Марозаў), а таксама расійскіх арганізацый «Трудовой Союз» і «Братство русской правды», нелегальны цэнтр якіх знаходзіўся ў Слоніме. Паводле сведчання Л. Гарошкі, яны займаліся інтрыгамі і даносамі ў дачыненні да Неманцэвіча, разглядаючы экзархат як вялікую перашкоду для сваёй дзейнасці. Варожа ставіліся да дзейнасці экзарха і некаторыя польскія дзеячы[71]. Ёсць таксама звесткі аб канфліктах А. Неманцэвіча з праваслаўным іерархам Апанасам Мартасам, які знаходзіўся ў той час у манастыры ў Жыровічах[72].

Незадаволены былі дзейнасцю Неманцэвіча і нацысцкія акупацыйныя ўлады. Яго дзейнасць апынулася ў фокусе ўвагі гестапа. Паводле сведчання Л. Гарошкі, Экзарха неаднаразова папярэджвалі аб тым, каб ён быў асцярожны, бо яго актыўнасць не падабаецца немцам. Але Неманцэвіч імкнуўся яшчэ больш пашырыць дзейнасць па распаўсюджванню ўніі на тэрыторыі Беларусі, дзеля чаго меў намер ехаць у Львоў для сустрэчы з мітрапалітам А. Шаптыцкім і абмеркавання з ім сваіх далейшых крокаў. Акупацыйныя ўлады не дазволілі яму ехаць на цягніку, як ён сам таго хацеў, падаўшы яму машыну з кіроўцам. Магчыма, нацысты хацелі такім спосабам лепш

[70] *Гарошка Л.* ... С. 53.
[71] Там жа. С. 52–53.
[72] *Usoszyn J.* ... S. 23.

кантраляваць усе кантакты і перамяшчэнні экзарха. Паездка ў Львоў працягвалася два тыдні і дазволіла Неманцэвічу зрабіць выснову, што мітрапаліт А. Шаптыцкі абмежаваны ў сваёй дзейнасці, а немцы настроеныя супраць уніі.

# Арышт і смерць айца Антона Неманцэвіча

Ноччу 4 ліпеня[73] (па іншых дадзеных, у пачатку жніўня 1942 г.)[74] айцец А. Неманцэвіч быў арыштаваны гестапа ў Альбярціне. Гестапаўцы не дазволілі яму ўзяць з сабой якія-небудзь рэчы, запэўніваючы, што ён хутка вернецца дадому. Але айцец Антон у Альбярцін так ужо ніколі і не вярнуўся.

Доўгі час пра яго далейшы лёс мала што было вядома. Каталіцкія іерархі спрабавалі даведацца пра яго якую-небудзь інфармацыю. У 1943 г. мітрапаліт А. Шаптыцкі афіцыйна і прыватна звяртаўся з гэтым пытаннем да нямецкіх уладаў. У лістападзе 1943 г. ён атрымаў афіцыйны адказ, згодна якому «*о. А. Неманцевич умер от тифа*» ў пачатку 1943 г. Аб лёсе экзарха спрабаваў даведацца і рыма-каталіцкі біскуп Генрык Вінкену, які з'яўляўся пасярэднікам паміж нямецкім епіскапатам і нацысцкімі ўладамі. Ён атрымаў інфармацыю, што Неманцэвіч памёр ад тыфу

73 *Маракоў Л. У.* ... С. 309.

74 *Гарошка Л.* ... С. 53; Я. Усошын выказаў меркаванне, што арышт Неманцэвіча адбыўся ў верасні 1942 г. у Беластоку. *Usoszyn J.* ... S. 21.

ў канцы 1942 г. Пры гэтым ніякіх звестак аб канкрэтнай даце смерці і месцы пахавання не паведамлялася[75].

У 2004 г. у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь быў знойдзены дакумент нямецкага акупацыйнага Генеральнага камісарыята Беларусі за подпісам оберштурмбанфюрэра СС Э. Штрауха, адрасаваны гаўляйтэру В. Кубэ. Згодна з гэтым дакументам у айца А. Неманцэвіча 30 лістапада 1942 г. быў дыягнаставаны плямісты тыф, пасля чаго яго перавезлі ў Мінск, дзе 6 студзеня 1943 г. ён памёр у шпіталі мінскай турмы СД ад сардэчнай недастатковасці, якая наступіла ў выніку плямістага тыфу. 9 студзеня 1943 г.[76] Неманцэвіч быў пахаваны на нямецкіх могілках у Мінску (цяпер гэта сквер на вуліцы Карла Лібкнехта) святаром мясцовай праваслаўнай царквы[77]. Дакладнае месца яго пахавання невядома.

Версію пра захворванне на тыф як прычыну смерці А. Неманцэвіча паставіў пад сумніў ужо яго сучаснік і намеснік святар Л. Гарошка, які адзначаў, што айцец Антоній перахварэў на тыф яшчэ ў дзяцінстве, таму меў імунітэт на гэтую хваробу, і, дарэчы, мог наведваць лагеры ваеннапалонных, дзе было шмат хворых на тыф. Л. Гарошка ўзгадваў наступны выпадак: аднойчы, калі А. Неманцэвіч вяртаўся з лагеру ў манастыр у Альбярціне, на ім заўважылі вош (вош — пераношчык тыфу). Аднак святар са смехам супакойваў прысутных: «*Не чапайце гэтай жывёлінкі, гэта ж мне падарылі яе бедныя людзі, выкарміўшы яе сваёй крывёю. Вам яна можа пашкодзіць, а мне нічагусенькі*».

75 *Гарошка Л.* ... С. 53–54.
76 *Гаек С., архім., Усошын Я., дыякан.* ... С. 155.
77 *Маракоў Л. У.* ... С. 309; *Гаек С., архім., Усошын Я., дыякан.* ... С. 161.

Л. Гарошка выказаў меркаванне, што насамрэч беларускі Экзарх памёр не ад тыфу, а быў закатаваны ў гестапа[78].

На думку беларускага гісторыка В. Пануцэвіча, айцец Неманцэвіч быў арыштаваны, а затым забіты немцамі ў выніку інтрыг праваслаўнага архіепіскапа Філафея Нарко супраць беларускіх актывістаў, якія выступалі за беларусізацыю праваслаўнай царквы на акупаванай нацыстамі тэрыторыі Беларусі[79]. Аднак В. Пануцэвіч не прывёў аргументаў у падтрымку сваёй версіі. Ён жа ў адной са сваіх прац выказаў здагадку аб сувязі арышту і смерці А. Неманцэвіча з паездкай экзарха да мітрапаліта Андрэя Шаптыцкага ў Львоў. На думку В. Пануцэвіча, гэтую паездку нямецкія спецслужбы расцанілі як выкананне Неманцэвічам задання, атрыманага ад групы рымска-каталіцкага святара В. Гадлеўскага, па ўсталяванні таемных кантактаў з украінскім бокам і Ватыканам. Немцы спадзяваліся, што арыштаваўшы Экзарха, яны змогуць атрымаць ад яго больш інфармацыі пра беларускі нацыянальны супраціў[80].

Сучасныя беларускія грэка-каталіцкія даследчыкі лічаць, што прычынай арышту Неманцэвіча была яго душпастырская дзейнасць[81]. На карысць таго, што арышт Экзарха быў выкліканы негатыўным стаўленнем нацыстаў да ўніі і перспектывы яе пашырэння, можа ўскосна сведчыць даклад кіраўніка мінскага СД Эдварда Штраўха на на-

---

78 *Гарошка Л.* ... С. 54.

79 *Волаціч М. (Вацлаў Пануцэвіч).* Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква // Запісы БІНІМ. 2004. Т. 27. С. 191–192.

80 *Пануцэвіч В.* Кс. Вінцэсь Гадлеўскі. Дзяржаўны Муж і Правадыр Народу // Беларуская царква (Чыкага). 1965. № 28. Рэжым доступу: http://pawet.net/library/history/bel_history/panuc/150html/. — Дата доступу: 11.02.2018.

81 *Usoszyn J.* ... S. 22.

радзе гэбіткамісараў і начальнікаў аддзелаў Генеральнага камісарыяту акупацыйнай акругі Беларусь ад 10 красавіка 1943 г., у якім, у прыватнасці, адзначаецца:

«*Без сумніву – царква гэта наш вораг. Натуральна, царква хоча папоўніць тут свае страты, якія яна зазнала ў Еўропе, а асабліва ў Рэйху. Яна мела намер гэта зрабіць праз пранікненне ў праваслаўную царкву, акольным шляхам праз уніяцкую Царкву [...]. Умовы для яе былі спрыяльныя, і рыма-каталіцкая Царква прыйшла сюды з вялікай колькасьцю прапаведнікаў і не сустрэла вялікіх цяжкасцяў [...]. Таму аднадушна мы вырашылі спыніць тут гэтую рыма-каталіцкую царкву [...]. Паколькі большасць духавенства прыняло бок палякаў, мне удалося іх злавіць і пакончыць з імі*»[82].

Беларускія грэка-каталіцкія даследчыкі таксама выказваюць думку, што арышт і смерць Экзарха маглі быць звязаныя з дапамогай габрэям з боку місіі езуітаў Альбярціна[83]. Гэты аспект патрабуе спецыяльнага вывучэння.

Такім чынам, дакладна адказаць на пытанне аб прычынах арышту Неманцэвіча і абставінах яго смерці на дадзены момант не ўяўляецца магчымым. Выклікае сумніў, што экзарх на самой справе ўключыўся ў антынацысцкую дзейнасць, улічваючы яго апалітычнасць, пра якую мы пісалі вышэй. Хутчэй, яго арышт быў выкліканы падазрэннем з боку акупантаў у тым, чаго ў сапраўднасці Неманцэвіч не здзяйсняў. Нельга выключаць і магчымасць яго фізічнага забойства нацыстамі. Застаецца спадзявацца, што ў будучым стануць вядомы новыя архіўныя дакументы, якія

[82] Цыт. па: *Гаек С., архім., Усошын Я., дыякан.* ... С. 160–161.
[83] *Гаек С., архім., Усошын Я., дыякан.* ... С. 158.

дазволяць канчаткова высветліць прычыны арышту ўніяцкага экзарха і абставіны яго смерці.

У красавіку 2009 г. капсула з зямлёй, узятай на тэрыторыі былых нямецкіх могілак — месцы пахавання Антона Неманцэвіча, была ўрачыста закладзена ў двары Грэка-Каталіцкага цэнтра Святога і Праведнага Язэпа ў Мінску (вул. Арджанікідзэ, 6). У цяперашні час у Беларускай Грэка-Каталіцкай Царкве захоўваецца памяць пра айца Антона Неманцэвіча. Гэта адна з тых асобаў, вакол якіх будуецца канфесійная ідэнтычнасць сучасных вернікаў БГКЦ. Беларускія грэка-католікі ўздымалі пытанне аб пачатку працэсу беатыфікацыі Неманцэвіча на той падставе, што лічаць яго смерць вынікам пакутніцтва ex aerumnis carceris (знясіленне ў турме)[84], аднак пакуль што беатыфікацыйны працэс не быў пачаты.

[84] Там жа. С. 163.

# ДАДАТАК

*Былыя Нямецкія могілкі ў Мінску, на якіх у студзені 1943 г. быў пахаваны А. Неманцэвіч. Цяпер сквер імя К. Лібкнехта. (фота 2018 г., зрабіў М. Дайняк)*







# Змест


Уводзіны . . . . . . . . . . 5
Дзяцінства. Маладыя гады . . . . . . . . . . 7
Святар. Душпастырская праца . . . . . . . . . . 12
Альбярцін . . . . . . . . . . 18
«Да Злучэньня» . . . . . . . . . . 26
Апостальскі Экзарх для Беларусі . . . . . . . . . . 30
Арышт і смерць айца Антона Неманцэвіча . . . . . . . . . . 39
Дадатак . . . . . . . . . . 44

Навуковае выданне

**Верамееў** Сяргей Фёдаравіч

**Антон Неманцэвіч.
Святар і пакутнік**

*У аўтарскай рэдакцыі*

*Фатаграфіі ўзятыя з агульнадаступных крыніц у інтэрнеце*

Адказны за выпуск Я. Андросік
Камп'ютэрны дызайн, вёрстка Ю. Глоба
Аўтар фота на тытульным лісце А. Крывенка

Падпісана да друку 14.06.2023. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 2,2. Улік.-выд. арк. 1,1.
Наклад 200 асоб. Замова 1 886 838.

Выдавец:
таварыства з абмежаванай адказнасцю «Альфа-кніга».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/480 ад 30.12.2015.
Вул. Смалячкова, 9/1, оф. 318, 220005, Мінск.

12+

Паліграфічнае выкананне:
таварыства з абмежаванай адказнасцю «Медысонт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 2/34 ад 23.12.2013.
Вул. Смалячкова, 9/1, оф. 113, 220005, Мінск.
www.medisont.by

Сяргей Фёдаравіч Верамееў (1986), скончыў Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны (2009 г.). Кандыдат гістарычных навук (2014), дацэнт (2017), загадчык кафедры філасофіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін ГДУ імя Ф. Скарыны; даследуе гісторыю хрысціянства ў Беларусі. Аўтар каля 100 навуковых артыкулаў; удзельнік беларускіх і міжнародных навуковых канферэнцый па гісторыі хрысціянства ў Беларусі.

Антон Неманцэвіч (1893–1943) — значная постаць у гісторыі Беларускай грэка-каталіцкай царквы XX ст. Святар, потым Апостальскі экзарх, багаслоў, педагог, публіцыст і выдавец, ён прымаў актыўны ўдзел у адраджэнні ўніяцкіх парафій на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. У дадзенай працы зробленая спроба абагульніць інфармацыю пра айца Антона Неманцэвіча, прадстаўленую ў навуковых публікацыях і ўспамінах сучаснікаў, і стварыць больш сістэматызаваны варыянт яго біяграфіі.

ISBN 978-985-7272-93-8

9 789857 272938